под

КУЛЬТУРА

# Водгукі Рэчы Паспалітай

Час нельга вярнуць назад, але ёсць сродкі, не падуладныя яму. Адным з такіх сродкаў з'яўляецца музыка. Усяго некалькі акордаў – і атмасфера часоў Рэчы Паспалітай запаўняе прастору. Вось гучыць вальс Напалеона Орды, следам за ім – рамансы Канстанціна Горскага ды іншых музыкаў XVII–XIX стагоддзяў. Усе творы таго часу сабраны ў нотныя сшыткі, колькасць якіх ужо дасягнула 10. Серыя заснавана ў 2008 годзе кампазітарам і даследчыкам, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Яўгенам Паплаўскім пры падтрымцы Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, універсітэта культуры і мастацтваў, Польскага інстытута ў Санкт-Пецярбургу.

**Марыя ДРУК, «Р»**



Фота Валерыя ХАРЧАНКІ, «Р»

*Кампазітар Ігар АЛОЎНІКАЎ (у цэнтры) і Яўген ПАПЛАЎСКІ на музычнай імпрэзе ў Нацыянальнай бібліятэцы.*